Падтрымай "Вясну" на PATREON

Баранавічы: год "хіміі" — за "здзек" над сцягам. Шкода склала 2 рубля 44 капейкі

01.06.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, грамадства, ціск



Ілюстрацыйнае фота spring96.org

31 траўня суд горада Баранавічы і Баранавіцкага раёна вынес прысуд 21-гадоваму Вячаславу Уласевічу. Яго прызналі вінаватым паводле арт. 370 Крымінальнага кодэкса і прысудзілі да года абмежавання волі з накіраваннем у выпраўленчую ўстанову — "хіміі".

Суд таксама абавязаў спагнаць з Уласевіча працэсуальныя выдаткі ў суме **васьмі капеек**.

Справу разглядала суддзя **А. В. Раманюк**, абвінавачванне прадстаўляла **Святлана Пасемка**.

Вячаслава Уласевіча прызналі вінаватым у тым, што трэцяга красавіка 2021 года каля 5.25-5.26 раніцы ён у стане алкагольнага ап'янення зняў сцяг з будынка па вуліцы Леніна. Пасля ён пранёс яго на некаторую адлегласць і кінуў на зямлю, з-за чаго дрэўка зламалася на тры часткі і пашкодзілася палатніна: **шкода ў памеры 2 рублі 44 капейкі** кампенсаваная абвінавачаным цалкам.

Каля 16 гадзін Уласевічу патэлефанавалі з Баранавіцкага ГАУС і запрасілі на сустрэчу: ён прыехаў, добраахвотна даў паказанні і напісаў яўку з павіннай. Яго затрымалі на трое сутак: з 3 па 6 красавіка — гэта час суд зачел ў тэрмін адбыцця пакарання з разліку "суткі за двое".

У судзе Вячаслаў таксама прызнаў віну. Да матэрыялаў справы была далучаная станоўчая характарыстыка з месца працы з хадайніцтвам да суду аб прымяненні максімальна мяккага пакарання, каб абвінавачаны мог працягваць сваю працоўную дзейнасць — папраўчыя работы.

Пракурор адзначыла, што абвінавачаны здзейсніў здзек над дзяржаўным сцягам і сімвалам Рэспублікі Беларусь і запрасіў **адзін год абмежавання волі з накіраваннем у выпраўленчую ўстанову адкрытага тыпу — хіміі** — столькі і прызначыў суд. Пракурор палічыў змякчальнай віну кампенсацыю шкоды ў 2,44 рубля, але не яўку з павіннай, паколькі яна была напісаная пасля ўзбуджэння крымінальнай справы.

Адвакат прасіў улічыць, што абвінавачаны ўпершыню прыцягваецца да крымінальнай адказнасці, пакрыццё шкоды, а станоўчыя характарыстыкі і прызначыць пакаранне ў выглядзе грамадскіх работ.

У апошнім слове Вячаслаў Уласевіч папрасіў прабачэння перад маці, прызнаў, што здзейсніў учынак па дурасці, і папрасіў не караць яго моцна.

Твитнуть







Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY